ют "работать с компанией, например, в области обработки и оценки данных, но не на компанию, не как ее работники".

С другой стороны, работники, способные поставлять на рынок готовый информационный продукт или иные уникальные блага, а не продавать свою рабочую силу, как это делали и делают индустриальные рабочие, даже в случае сотрудничества с той или иной компанией, имеют возможность в любой момент выйти из ее структуры. Они "не принадлежат к пролетариату, не могут быть эксплуатируемы как класс" и "должны быть управляемы таким образом, как если бы были членами добровольных организаций".

Сегодня становится очевидным, что изобилие материальных благ приводит к становлению постиндустриального общества и порождает новые, постматериалистические ценности современного человека. Его стремление к максимальному саморазвитию, являющееся важнейшим источником прогресса, предполагает не насыщение потребностей, а безгранично расширяющееся потребление информационных благ. Впервые в истории условием принадлежности человека к господствующему классу становится не право владеть благом, а способность им воспользоваться. Следовательно, социальный статус человека определяется прежде всего его образовательным уровнем, способностью превращать информацию в знания, самостоятельно осуществлять продуктивную деятельность в условиях технологически совершенного хозяйства.

ЛИТЕРАТУРА

1. Антипина О., Иноземцев В. Диалектика стоимости в постиндустриальном обществе // Мировая экономика и международные отношения. 1998. № 9-11.
2. Лебедев П. Инвентаризация интеллектуальной собственности // Белорусский рынок. 2000, № 6.
3. Лемещенко П.С. Теория и практика радикальной реформы // Политическая экономия. 1989. №17.

УДК 339.13

А.У. Яфімаў, асістэнт

## ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАСНАСЦІ ЯК ШЛЯХ ДАСЯГНЕННЯ МАКРАЭКАНАМІЧНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

This article is devoted to the role of privatization of state-owned enterprises in obtaining the macroeconomic stability.

Прыватызацыя, як працэс пераходу ўласнасці ад дзяржавы прыватніку, разам з раздзяржаўленнем з'яўлялася адной з самых актуальных эканамічных з'яў у мінулым XX стагоддзі, якія прыцягвалі да сябе ўвагу шырокіх колаў грамадства. Такі характар стаўлення да яе быў у вялікай ступені абумоўлены тымі сацыяльна-гаспадарчымі наступствамі, што ўзніклі пасля яе правядзення, і палітыка-эканамічнымі эфектамі, якія суправаджалі яе рэалізацыю.

Трэба адзначыць, што сярод эканамістаў-тэарэтыкаў па сённяшні дзень не існуе адзінай думкі наконт неабходнасці ажыццяўлення прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці ў тых ці іншых умовах народнагаспадарчага развіцця, агульнапрынятых падыходаў да этапаў, шляхоў і паслядоўнасці яе рэалізацыі, а таксама распаўсюджанага меркавання аб параўнальнай эфектыўнасці прыватных эканамічных суб'ектаў у адносінах да аналагічных ім дзяржаўна-ўласных. Такое несупадзенне поглядаў на атрыбуты дадзенай

эканамічнай з'явы мае перад сабой досыць абгрунтаваныя факты практычных гаспадарчых рэаліяў.

Так, аналізуючы прыватызацыйныя працэсы ў Вялікабрытаніі, што сталі ажыццяўляцца з 1979 года пасля перамогі на парламенцкіх выбарах Кансерватыўнай партыі на чале з М. Тэтчар, англійскі эканаміст Дж. Бэрдшоў адзначае наступныя станоўчыя бакі функцыянавання прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы [1]: 1)наяўнасць сацыяльных выгодаў для асобных пластоў грамадства, калі тавар альбо паслугу можна рэалізаваць па заніжаным кошце з яе льгатаваннем (праезд у грамадскім транспарце для пенсіянераў ці студэнтаў); 2)выключная магчымасць прадастаўлення неабходнага інвестыцыйнага капіталу для мадэрнізацыі асобных галінаў гаспадаркі, а таксама рэалізацыі даследчых праектаў, якія патрабуюць настолькі значнага ў памерах фінансавання, што яго можа дазволіць сабе толькі дзяржава (атамная энергетыка і самалётабудаванне); 3)магчымасць захавання кантролю за прадпрыемствамі, якія канфліктуюць са знешнім асяроддзем (яго забруджванне); 4)пераважныя выгоды ад існавання манаполіяў у той ці іншай сферы эканомікі (рацыянальнае выкарыстанне эфекту маштабу, недапушчэнне марнавання рэсурсаў, неабходны нагляд за дзейнасцю дамінуючых на рынку арганізацыяў); 5)матывы стратэгічных інтарэсаў дзяржавы (забеспячэнне нацыянальнай абароны краіны).

У сваю чаргу, вядомы польскі эканаміст і грамадскі дзеяч Л. Бальцэровіч пры разглядзе розных тыпаў эканамічных сістэмаў прыводзіць у якасці адмоўных бакоў захавання гаспадарчых арганізацыяў пад кантролем дзяржавы наступныя [2]: 1)адсутнасць стымулаў да эфектыўнай працы (праяўляецца ў адсутнасці скіраванай дзейнасці прадпрыемства на дасягненне максімізацыі свайго прыбытку з-за імкнення ўладных палітыкаў здабыць сабе папулярнасць шляхам эканамічна неабгрунтаваных дзеянняў); 2)распаўсюджанасць карупцыі і бюракратызму (неакрэсленыя дакладна правы ўласнасці, магчымасць злоўжывання кіраўніцкім статусам з боку чыноўніцтва); 3)манапольнае права дзяржавы на выпуск грошай у абарачэнне, а таксама стварэнне заканадаўчай сістэмы (субсідаванне стратных прадпрыемстваў шляхам друкавання грошай, прававая абарона дзейнасці арганізацыяў); 4)палітычная сутнасць дзяржавы (несупадзенне яе інтарэсаў і мэтаў развіцця прадпрыемства).

Як бачым, прыхільнікі абедзвюх формаў уласнасці маюць пэўную рацыю. Да вышэйадзначаных супярэчнасцяў варта было б дадаць таксама адрозненне ў поглядах і перакананнях эканамістаў і палітыкаў розных школаў і кірункаў (больш станоўча да першаснай ролі дзяржавы традыцыйна ставяцца дзеячы сацыял-дэмакратычных і сацыялістычных партыяў, а таксама прадстаўнікі посткейнсіянскага кірунку, і наадварот, лібералы і кансерватары разам з неакласікамі схільныя аддаваць перавагу вольнаму рынку ў якасці рэгулявальніка эканамічных працэсаў). Калі ўзгадаць яшчэ і гістарычныя ўмовы кіравання пэўных палітычных элітаў, можна ўбачыць перш за ўсё ў эканамічна развітых краінах пэўныя хвалі спачатку нацыяналізацыі (адзяржаўлення), як у Францыі ў 1936, пасля перамогі Народнага фронту, у 1939–45, пасля вызвалення, у 1982, з пачаткам прэзідэнцтва Ф. Мітэрана [3], у Вялікабрытаніі з 1908 па 1939, у 1945–51, у лейбарысцкім урадзе К. Этлі, пазней у 60-х і 70-х гадах [1], а потым прыватызацыі як раней нацыяналізаваных, так і іншых прадпрыемстваў (у Францыі з канца 80-х, у Вялікабрытаніі падчас вышэйзгаданага кіравання М. Тэтчар) [4].

Аднак трэба адзначыць, што, як у краінах Еўрапейскага Саюза, так і ў ЗША, прыватны сектар з'яўляецца дамінуючым як па колькасці занятых у ім працаўнікоў, так і па долі ў ВГП. Гэта звязана з тым, што прыватызацыя прадпрыемстваў дазволіла дасяг-

нуць рэалізацыі наступных сацыяльна значных мэтаў: стварэння і падтрымання канкурэнтнага асяроддзя ў розных сферах экономікі; паляпшэння эфектыўнасці выкарыстання наяўных абмежаваных прыродных, фінансавых і працоўных фактараў вытворчасці; скарачэння дзяржаўных выдаткаў на падтрыманне стратных і нізкаэфектыўных фірмаў; перакладання адказнасці за вынікі гаспадарання з дзяржавы на саміх прыватных уласнікаў, г. зн. нефінансаванне іх магчымых стратаў, што могуць з'явіцца ў выніку банкруцтва, з дзяржаўных фондаў, а значыць, за кошт падаткаплацельшчыкаў; папаўнення бюджэту за кошт продажу дзяржаўных прадпрыемстваў. Сродкі ад адзіначасовай прыватызацыі могуць часам дасягаць некалькіх працэнтаў ад даходнай часткі дзяржаўнага бюджэту, што часам дазваляе, у сваю чаргу, пашырыць фінансаванне сацыяльных праграмаў. Так, за 1990–99 гады даходы ад прыватызацыі склалі: у Італіі – 98,9 млрд. амер. долараў, Аўстраліі – 63,4, Вялікабрытаніі – 63,1, Францыі – 58,1, Японіі – 37,7, Іспаніі – 36,6, Мексіцы – 28,2, Партугаліі – 22 і г. д. [5].

У адрозненне ад т. зв. эканамічна развітых краінаў свету, дзе рынкавы тып гаспадаркі ўзнік і паспяхова функцыянуе на працягу двух стагоддзяў і працэсы перадачы права маёмасці ад дзяржавы да асобнага ўласніка і наадварот прадыктаваныя пераважна меркаваннямі сацыяльна-палітычнай кан'юнктуры, у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, якія раней уваходзілі ў т. зв. сацыялістычны блок, прыватызацыя дзяржаўнай маёмасці набывае прынцыпова іншы змест. Яна выступае перш за ўсё ў якасці неад'емнага складніка працэсу пераходу ад камандна-планавага тыпу эканамічнай сістэмы, які функцыянаваў у гэтых дзяржавах раней, да рынкавага (капіталістычнага) ладу гаспадарання. У гэтых умовах перад дзяржавай паўстаюць праблемы эфектыўнага выкарыстання наяўных эканамічных рэсурсаў і фактару часу для дасягнення найлепшых поспехаў у працэсе такой трансфармацыі экономікі, падтрымання макраэканамічнай стабільнасці, адным са складнікаў якой выступае эфектыўная рэалізацыя працэсу прыватызацыі вялізарнай, часам неабсяжнай дзяржаўнай маёмасці.

Аналізуючы вынікі праведзенай прыватызацыі, эксперты МВФ падзяляюць вызначаныя 26 краінаў з экономікамі транзітыўнага тыпу на 2 асобныя часткі: цэнтральна- і ўсходнееўрапейскія краіны і дзяржавы Балтыі; краіны СНД [6]. З улікам таго, што прыватызацыя (змена формы ўласнасці) з'ўляецца першым этапам аднаўлення эфектыўнага функцыянавання прадпрыемства, за якой павінна абавязкова ісці рэструктурызацыя (змена кірункаў развіцця), адзначаецца, што прыватызаваныя прадпрыемствы першай групы краінаў здолелі хутчэй прыстасавацца да новых умоваў гаспадарання, чым дзяржаўныя, дзякуючы актыўнаму ўдзелу ў трансфармацыйным працэсе замежных інвестараў, а таксама адносна спрыяльнаму знешняму асяроддзю, у той час як краіны СНД, правёўшы не зусім паслядоўную прыватызацыю сваіх гаспадарчых суб'ектаў, не здолелі дасягнуць пажаданых вынікаў і падштурхнуць працэсы структурнай перабудовы з-за дрэннай якасці кіравання на такіх прадпрыемствах, а таксама наяўнасці мяккіх бюджэтных абмежаванняў з боку дзяржавы. Гэта паспрыяла таму, што краіны першай групы ў 2000 годзе выйшлі на ўзровень ВГП 106,5 % у параўнанні з 1990 годам, калі пачаліся рэформы, а краіны СНД дасягнулі толькі 62,7 % ад паказчыка дзесяцігадовай даўнасці [7].

Што тычыцца вынікаў рэфармавання беларускай экономікі, то эксперты ЕБРР ставяць яе на перадапошняе 25 месца сярод 26 краінаў (перад Туркменістанам), а гэта не можа не заклапочваць. Адзначаючы нізкія тэмпы рэфармавання нацыянальнай экономікі, што выявілася ў практычнай адсутнасці макраэканамічнай стабілізацыі і прагрэсу ў структурных рэформах (сярэднегадавы ўзровень інфляцыі ў 1991–2000 – 344 %,

у той час як у Польшчы – 26 %, Літве – 88 %, памеры прыватнага сектара ў ВГП у 1999 – 20 %, у Чэхіі – 80 %, Расіі – 70 %, невялікая частка занятых на малых і сярэдніх прадпрыемствах у 1998 – 15,9 %, у Польшчы – 45,7 %, Літве – 55,1 %), аглядальнікі ўказваюць наступныя фактары росту беларускай эканомікі пасля 1996 года: экспарт танных энерганосьбітаў з Расіі і аплата за іх праз бартэрныя схемы; фінансавая падтрымка дзяржавай перш за ўсё вялікіх прадпрыемстваў праз ільготы і субсідаванне; значны дзяржаўны кантроль за актывамі непрыватызаваных прадпрыемстваў [7].

Падводзячы высновы, можна адзначыць, што прыватызацыя як працэс змены правоў уласнасці павінна так арганічна ўвайсці ў беларускую гаспадарчую рэчаіснасць, як гэта ёсць не толькі ў развітых, але і суседніх краінах, якія дасягнулі поспехаў у рэформах дзякуючы правільнаму разуменню ролі прыватніка ў эканоміцы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Бэрдшоў Дж. Эканоміка. Ч.1: Уводзіны. Мікраэканоміка / Пад рэд. У. Кулажанкі. – Мн.: Тэхналогія; Беларускі Фонд Сораса, 1996. – 560 с.
2. Бальцэровіч Л. Капіталізм. Сацыялізм. Трансфармацыя. – Мн.: Лекцыя, 2000. – 344 с.
3. J.-Y.Capul, O.Garnier. Dictionnaire d'économie et de sciences sociales. Paris: Hatier, 1999.
4. Routledge encyclopedia of international political economy / Ed. by R.J.Barry Jones. Vol. 3 (P-Z). London&New York: Routledge, 2001.
5. L'OCDE en Chiffres. Statistiques sur les pays members. L'Observateur de l'OCDE 2002/ Supplément 1. Paris: OCDE, mai 2002.
6. World Economic Outlook. October 2000. Focus on Transition Economies. Washington, D.C.: International Monetary Fund, 2000.
7. Transition. The First Ten Years. Analysis and Lessons for Eastern Europe and the Former Soviet Union. Washington, D.C.: The World Bank, 2002.


УДК 502.3:006.354

Л.В. Дернович (Начальник технического отдела ОАО «Мозырьсоль»)

# ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ОПЫТА СОЗДАНИЯ И ФУНКЦИОНИРОВАНИЯ СИСТЕМЫ УПРАВЛЕНИЯ КАЧЕСТВОМ В СООТВЕТСТВИИ С ИСО 9002 ПРИ РАЗРАБОТКЕ СИСТЕМЫ УПРАВЛЕНИЯ ОКРУЖАЮЩЕЙ СРЕДОЙ ПО ИСО 14001 НА ОАО «МОЗЫРЬСОЛЬ»

Results of the work on development and introduction of a control system by quality on ISO 9002 on JSC "Mozyrsalt" are submitted. The opportunity of use the basic organizational and administrative decisions fulfilled on a control system by quality for creation of a control system by an environment on ISO 14001 is shown.

В конце 70-х – начале 80-х годов XX столетия в БССР предпринималась попытка административными (приказными) методами организовать разработку, внедрение и функционирование систем качества. Многими предприятиями эти системы были разработаны в виде комплексных систем управления качеством продукции (КС УКП). Однако фактически с первых дней их появления они были не востребованы, так как в них отсутствовал комплексный подход к решению вопросов качества продукции.

С началом интегрирования в мировой рынок народного хозяйства РБ предприятия концерна «Белгоспищепром» столкнулись с различного рода проблемами. В спи-